ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІЯ, ФАЛЬКЛОР

ART HISTORY, ETHNOGRAPHY, FOLKLORE

УДК 39
https://doi. org/10.29235/2524-2369-2022-67-1-69-79

Паступіў у рэдакцыю 31.08.2021
Received 31.08.2021

Ю. І. Внуковіч

Pwglj ^Zke_^Z\Zggy† [_eZjmkdZc dmevlmju fh\u • e•lZjZlmju
GZpuygZevgZc ZdZ^wf•• gZ\md ;_eZjmk• F•gkd ;_eZjmkv

ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫВУЧЭННЯ ЭТНІЧНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ

Аннотация. Рассматриваются теоретико-методологические подходы к изучению понятия «этническая идентичность» как ключевого инструмента научного анализа в современной культурной антропологии и этнологии. Охарактеризованы примордиалистская, инструменталистская и конструктивистская концепции этничности, по-разному определяющие роль объективных и субъективных характеристик ее выражения.

Примордиалистам присуще выделение этносов как органических этнических общностей, различение которых построено на «изначальных» культурных различиях («данностях»). Конструктивисты и инструменталисты концентрируют свое внимание на социальной организации этнических различий и различений, базирующейся на ситуативных процессах включения и исключения. Этническая идентичность, понимаемая с позиций конструктивизма, рассматривается как символическая конструкция – социально-изобретенная, дискурсивно-опосредованная и культурно-маркированная.

Особое методологическое значение в изучении этнической идентичности имеет выяснение характерных различительных признаков, отделяющих одну этническую группу или категорию от другой. Это предопределяет исключительную роль сравнительно-этнографических методов исследования, направленных на выявление «этнических границ» и «этнических маркеров».

Ключевые слова: этническая идентичность, этничность, этнические группы, культурные различия, примордиализм, инструментализм, конструктивизм, методология, этнология

Для цитирования: Внуковіч, Ю. І. Тэарэтыка-метадалагічныя падыходы да вывучэння этнічнай ідэнтычнасці / Ю. І. Внуковіч // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2022. – Т. 67, № 1. – С. 69–79. https://doi. org/10.29235/2524-2369-2022-67-1-69-79

Yury I. Vnukovich

&HQWHU IRU 5HVHDUFK RI %HODUXVLDQ &XOWXUH /DQJXDJH DQG /L
RI 6FLHQFHV RI %HODUXV 0LQVN %HODUXV

THEORETICAL AND METHODOLOGICAL APPROACHES TO ETHNIC IDENTITY

Abstract. The article discusses theoretical and methodological approaches to the study of "ethnic identity" as a key tool of scientific analysis in cultural anthropology and ethnology. The primordialist, instrumentalist and constructivist theories of ethnicity, which in different ways determine the role of the objective and subjective characteristics of its expression, are characterized.

Primordialist view on ethnos as organic ethnic unit is based on "primordial" cultural differences ("givens"). Constructivists and instrumentalists have mainly focused on the social organization of ethnic differences and distinctions based on situational processes of inclusion and exclusion. From the standpoint of constructivism, ethnic identity is viewed as a symbolic construct – socially invented, discursively constructed and culturally marked.

In the study of ethnic identity, an important role is played by the revealing of the specific distinctive features that separate one ethnic group or category from another. For this, it is necessary to use comparative ethnographic methods aimed at identifying "ethnic boundaries" and "ethnic markers".

© Внуковіч Ю. І., 2022

С. І. Рыжаковай [12], М. В. Лескінен [13] і інш.). Пра высокую ступень зацікаўленасці феноменам калектыўнай ідэнтычнасці ў навуковым акадэмічным асяроддзі сведчыць рост колькасці міжнародных канферэнцый і секцый, прысвечаных аналізу гэтай з'явы.

У беларускай гуманітарыстыцы тэрмін «этнічная ідэнтычнасць» звычайна кадзіруецца пад больш агульным паняццем «нацыянальная ідэнтычнасць» (або «нацыянальна-культурная ідэнтычнасць»), што ў якасці клішэ глыбока ўкаранілася ў навуковым і публічным дыскурсе не столькі як інструмент навуковага аналізу, колькі як шырокая катэгорыя практыкі. Адрозненне паміж гэтымі тэрмінамі даволі невыразнае, неразборлівае, нюансавае [14, с. 476]. Часта яны выступаюць фактычнымі сінонімамі або суадносяцца, як паняцці «нацыя» і «этнас»: «нацыянальная ідэнтычнасць» часцей фігуруе ў «мадэрным», гістарычным і дзяржаўна-палітычным кантэксце, у той час як «этнічная ідэнтычнасць» выкарыстоўваецца для абазначэння моўна-культурнай тоеснасці/адрознасці людзей, што склалася яшчэ ў «дамадэрны» перыяд. Так ці інакш, пад «ідэнтычнасцю» імпліцытна разумеецца нешта глыбіннае, сутнаснае, што ляжыць у падмурку, гэта значыць тое, што абавязкова трэба цаніць, падтрымліваць і захоўваць. Пры гэтым галоўны акцэнт робіцца на сімвалічнай агульнасці і адзінстве беларускай нацыі (што непарыўна захоўваецца ў часе і прасторы), а не на яе этнакультурнай шматстайнасці, зменлівасці і кантэкстуальнасці.

Празмернае і неразборлівае ўжыванне тэрміна «ідэнтычнасць» у апошнія гады жорстка крытыкавалася і дэталёва аналізавалася. Як падкрэсліваюць многія даследчыкі ідэнтычнасці, дарэчы і недарэчы выкарыстоўваючы гэты тэрмін, некаторыя аўтары часта проста аддаюць даніну модзе і не заўсёды дакладна разумеюць яго глыбіннае значэнне і тэарэтычную сутнасць [15, с. 66–67; 16, с. 144–145; 17, с. 5]. Па словах амерыканскага сацыёлага Р. Брубэйкера, які прааналізаваў «слабае» і «моцнае» ўжыванні гэтага тэрміна, крызіс «ідэнтычнасці» ў сучасным свеце – гэта крызіс перавытворчасці і наступнай дэвальвацыі яе сэнсаў, што не выяўляе ніякіх прыкмет завершанасці [1, с. 67]. Але, як сцвярджае нарвежскі антраполаг Т. Х. Эрыксен, існуюць важкія прычыны таго, чаму такія паняцці, як «ідэнтычнасць», «глабалізацыя» ці «інфармацыйнае грамадства» ператвараюцца ў клішэ: звычайна так адбываецца, калі імі абазначаюць нешта вельмі важнае [18, с. 17]. Сапраўды, даволі цяжка падабраць больш трапны тэрмін для абазначэння пачуцця агульнасці, заснаванага на ўсведамленні ўнікальнасці і адметнасці сваёй культуры, чым тэрмін «ідэнтычнасць». Ці не таму выкарыстанне гэтага тэрміна ў такім значэнні задавальняе патрэбы большасці сучасных этнолагаў і антраполагаў?

Даследчы падыход да праблемы этнічнай ідэнтычнасці ў першую чаргу вынікае з разумення і вызначэння базавых катэгорый этналогіі – «этнасу» або «этнічнасці», якія патрабуюць больш падрабязнага разгляду.

У амерыканскай і заходнееўрапейскай антрапалагічнай традыцыі этнічная ідэнтычнасць як спецыфічны калектыўны феномен, што выяўляе тоеснасць членаў этнічнай групы або катэгорыі, цесна звязана з паняццем *этнічнасці*. Нягледзячы на вялікую папулярнасць за мяжой, гэты тэрмін практычна адсутнічаў у паняційным апараце савецкай этнаграфіі, дзе асноўнай катэгорыяй аналізу доўгі час выступала паняцце *этнасу* [5, с. 96–100; 17, с. 4; 19, с. 48, 79–80].

У наш час прынята ўмоўна адрозніваць тры асноўныя тэарэтычныя падыходы да разумення і вывучэння этнічнасці: прымардыялісцкі, інструменталісцкі і канструктывісцкі [19, с. 108–109; 20, с. 113; 21, с. 4–8]. Адзначым таксама, што ва ўмовах тэарэтычнага плюралізму, які пануе ў сучаснай навуцы, у працах многіх даследчыкаў, што займаюцца вывучэннем этнічнай ідэнтычнасці, пры жаданні можна знайсці рысы супрацьлеглых канцэпцый [22].

Прыхільнікі ***прымардыялісцкага***[1] (эсенцыялісцкага) падыходу разглядаюць этнічныя з'явы як аб'ектыўна дадзеную рэчаіснасць, дэтэрмінаваную прыроднымі, гістарычнымі і сацыяльнымі фактарамі. Цалкам у межах гэтага падыходу развівалася савецкая этнаграфічная навука, пераважна пад яго ўплывам застаецца і постсавецкая этналогія (у тым ліку беларуская). Ключавой аналітычнай катэгорыяй у даследаваннях яго прадстаўнікоў выступае паняцце «этнас», якое амаль цалкам адсутнічае ў амерыканскай і заходнееўрапейскай навуцы. Галоўным распра-

[1] Ад лац. *primordialis* – «першапачатковы, зыходны, спрадвечны».

цоўшчыкам тэорыі этнасу ў савецкі час быў Ю. У. Брамлей [23]; у межах гэтай навуковай парадыгмы таксама працавалі М. М. Чэбаксараў [24], С. А. Арутюнаў [25], В. І. Казлоў [26] і інш. Яны разглядалі этнічныя супольнасці найперш як супольнасці людзей з аб'ектыўнымі характарыстыкамі прыналежнасці: тэрыторыя, мова, эканоміка, расавы тып, рэлігія, светапогляд і нават псіхічны склад [5, с. 101]. Такое разуменне гэтага паняцця зрабілася пануючым у беларускай этналогіі: «Этнас, этнічная супольнасць (ад грэч. ethnos – племя, народ) – устойлівая супольнасць людзей, якая склалася гістарычна на пэўнай тэрыторыі і характарызуецца агульнасцю мовы, побыту, культуры, рыс псіхікі і самасвядомасці, адлюстраванай у адзінай назве і ўяўленнях пра агульнасць паходжання» [27, с. 547]. Менавіта на гэтым тэарэтычным падмурку праводзілі свае даследаванні большасць беларускіх этнолагаў канца XX – пачатку XXI ст. [28].

У заходняй навуцы галоўным ідэолагам класічнага прымардыялізму прынята лічыць К. Гірца – вядомага амерыканскага семіётыка культуры, заснавальніка інтэрпрэтатыўнай антрапалогіі і канцэптуалізатара «насычанага апісання» (англ. thick description) як асноўнага этнаграфічнага метаду. Нягледзячы на тое, што К. Гірц катэгарычна выступаў супраць таго, каб «уяўляць культуру як самадастатковую "звышарганічную" рэчаіснасць, якая валодае ўласнымі рухаючымі сіламі і мэтамі, гэта значыць рэіфікаваць яе» [29, с. 17–18], этнічную ідэнтычнасць ён асацыіраваў з «спрадвечнымі пачуццямі», «першапачатковымі прыхільнасцямі», абумоўленымі пэўнымі «данасцямі» сацыяльнага быцця (ці тым, што лічыцца такімі «данасцямі»): суседскімі і сваяцкімі сувязямі, данасцю, якая вынікае з таго, што чалавек нараджаецца ў пэўнай рэлігійнай абшчыне, размаўляе на пэўнай мове ці нават на дыялекце гэтай мовы і прытрымліваецца пэўных грамадскіх звычаяў. Згодна з К. Гірцам, такія супадзенні, якія выпадаюць нам пры нараджэнні, валодаюць неверагоднай, а часам і непераадольнай сілай [29, с. 297].

Такім чынам, для прыхільнікаў прымардыялізму існаванне чалавека не бачыцца па-за этнасам, які разглядаецца як аб'ектыўная, арганічная «данасць». Такое разуменне этнічнага прывяло да выпрацоўкі мадэлі свету, які складаецца з асобных народаў як суб'ектаў, што валодаюць уласнымі агульнымі культурамі. Адпаведна гэтай логіцы этнічныя групы ідэнтыфікуюцца і дыферэнцыруюцца паводле марфалагічных характарыстык культур, носьбітамі якіх яны з'яўляюцца. Па сутнасці, адрозненні паміж этнічнымі групамі зводзяцца класічнымі прымардыялістамі да адрозненняў паміж унікальнымі наборамі кампанентаў культуры.

Хоць на прафанным («абывацельскім») узроўні прымардыялізм фактычна працягвае дамінаваць, у сучасных гуманітарных навуках ён успрымаецца як састарэлая тэарэтычная мадэль [5, с. 104], якая пры гэтым мае каласальную навуковую (асабліва, эмпірычную) спадчыну. Рэч у тым, што прымардыялісцкі погляд на этнічнасць і этнічныя адрозненні звязваў іх з «першапачатковымі», «прыроджанымі» феноменамі, якія аказаліся папросту не сумяшчальнымі з рэаліямі сучаснага грамадства [30, с. 141–142].

Кагнітыўны паварот у культурнай антрапалогіі і этналогіі ў другой палове XX ст. абумовіў адыход ад аб'ектывізму і пераход ад вызначэння нацый або этнасаў паводле прыкмет агульнай мовы, культуры, тэрыторыі, гісторыі і г. д. да вызначэнняў, якія падкрэсліваюць суб'ектыўны сэнс, адносны і сітуацыйны характар этнічнасці.

У межах • g k l j m f _ g l Z e • k p d l x d h Z, які канцэптуальна звязаны з канструктывізмам, даследчыкі этнічнай ідэнтычнасці (А. Коэн [31], Д. Горавіц, Ю. Рузэнс, К. Янг [20] і інш.) галоўны акцэнт робяць на групавых інтарэсах людзей, а этнічнасць разглядаюць як сродак (інструмент) дасягнення гэтых інтарэсаў, што выкарыстоўваецца найперш палітычнай элітай для мабілізацыі насельніцтва ў барацьбе за ўладу. У адрозненне ад прымардыялісцкага падыходу да трактоўкі этнасу і этнічнасці, інструменталісцкі арыентаваны на выяўленне ўтылітарных функцый, якія выконваюць этнічныя групы як супольнасці, не займаючыся пошукам аб'ектыўных падстаў іх існавання.

Інструменталісцкая трактоўка сацыяльнай ролі этнічнасці знаходзіць шмат эмпірычных пацвярджэнняў і з'яўляецца настолькі ўплывовай, што гэты падыход атрымаў шырокае прызнанне ў якасці самастойнай тэорыі, нароўні з прымардыялізмам і канструктывізмам [30, с. 155]. Падыход да этнічнай ідэнтычнасці, як да сімвалічнага і рэальнага капіталу, дазволіў зрабіць шэраг важных вывадаў і назіранняў, асабліва ў сферы эканамічных і сацыяльных адносін, а таксама ў сферы палітыкі, моўных і міжэтнічных канфліктаў [5, с. 104].

традыцыйнай культуры і ўсталяванню гістарычных традыцый, закліканых апраўдваць і ўзносіць стэрэатыпы і ідэнтычнасці» [36, с. 44].

Такое разуменне феномена этнічнасці, у адрозненне ад прымардыялісцкага падыходу, вызначае яе зменлівы, кантэкстуальны і сітуацыйны, гэта значыць рэлятыўны (адносны) характар.

Адной з тэм, да канца не раскрытых Ф. Бартам у яго знакамітай працы, было пытанне, наколькі адвольна могуць змяняць сваю этнічную ідэнтычнасць людзі ў тых або іншых сітуацыях. Напрыклад, В. Цішкоў адзначае, што выбар чалавекам прыналежнасці да этнічнай супольнасці – гэта хоць і адвольны, але не абавязкова свабодны (!) працэс [5, с. 121]. Сам Ф. Барт у сваіх пазнейшых працах прыйшоў да высновы, што выбар ідэнтычнасці з'яўляцца куды менш выпадковай з'явай, чым яму гэта падавалася ў 1969 г. [37, p. 16]. А яго знакаміты зямляк Т. Х. Эрыксен лічыў магчымасць індывідуальнага выбару этнічнай ідэнтычнасці як бы зацяснутай паміж сітуацыйным адборам і калектыўнымі прадпісаннямі, што навязваюцца звонку [38, p. 66].

Так ці інакш, генератыўны падыход Ф. Барта, заснаваны на ідэі, што сімвалічнае вымярэнне культурных адрозненняў груп людзей не кангруэнтнае іх рэальным культурным адрозненням, быў падхоплены і развіты ў працах шэрагу сучасных антраполагаў і этнолагаў па ўсім свеце. Цэнтральнай тэмай іх даследаванняў стала этнічная ідэнтычнасць як своеасаблівая сімвалічная канструкцыя – сацыяльна-вынайдзеная, дыскурсіўна-апасродкаваная і культурна-маркіраваная.

Бадай самай вядомай і ўплывовай у сучаснай гуманітарыстыцы стала тэарэтычная канцэпцыя амерыканскага гісторыка і палітолага Б. Андэрсана, аўтара знакамітай кнігі «Уяўленыя супольнасці. Развагі пра паходжанне і распаўсюджанне нацыяналізму»[1]. Ключавую ролю ў з'яўленні нацый сучаснага тыпу ён адводзіў калектыўнаму ўяўленню: «Нацыя – гэта ўяўленая палітычная супольнасць, і ўяўляецца яна як нешта непазбежна абмежаванае, але ў той жа час суверэннае. Яна ўяўленая, бо члены нават самай маленькай нацыі ніколі не будуць ведаць большасці сваіх братоў-па-нацыі, сустракацца з імі ці нават чуць пра іх, у той час як у галовах кожнага з іх жыве вобраз іх агульнасці» [33, с. 47]. Пры гэтым у сфармуляванае такім чынам паняцце «ўяўленага» Б. Андэрсан не ўкладаў адмоўнага значэння фальшыўкі ці фабрыкацыі, хутчэй, наадварот, – падкрэсліваў яго творчы, крэатыўны і вынаходніцкі характар.

Нацыя як культурная мадэль, якую можна трансплантаваць («перанесці», «запазычыць»), з'явілася ў Заходняй Еўропе ў канцы XVIII ст. Галоўнымі перадумовамі яе з'яўлення былі заняпад рэлігійных спосабаў мыслення (на змену якім прыйшлі нацыянальныя) і шырокае распаўсюджванне друкаваных раманаў і газет – базісных, паводле Б. Андэрсана, структур чалавечага ўяўлення таго часу [33, с. 73]. Асаблівую ролю ў працэсе фарміравання нацый адыграў так званы «друкаваны капіталізм» – феномен, аналіз якога займае адно з цэнтральных месцаў у канцэпцыі Б. Андэрсана. Менавіта ён дазволіў вялікай колькасці людзей асэнсоўваць (або ўяўляць) сябе і іншых прынцыпова новым спосабам. Фарміраванне нацый – новых уяўленых супольнасцей – робіцца магчымым як вынік узаемадзеяння паміж сістэмай вытворчых адносін (капіталізмам), тэхналогіяй камунікацыі (друк) і фатальнасцю лінгвістычнай разнастайнасці чалавецтва. Гэты апошні элемент уяўляецца найбольш істотным [33, с. 225; 39, с. 50–51].

Паводле Б. Андэрсана, вылучэнне і класіфікацыя вялікіх груп людзей (на падставе пэўных прыкмет) патрабуе спецыфічных спосабаў мыслення іх адрознення і атаясамлення. Аднымі з галоўных інструментаў такога «ўяўлення» народаў, што атрымалі сваё пашырэнне ў XIX ст. у вялікіх каланіяльных дзяржавах, сталі магутныя інстытуты ўлады – друкаваныя карты, перапісы насельніцтва і музеі [33, с. 266–300]. Усе яны былі цесна ўзаемазвязаны паміж сабой і зрабілі непасрэдны ўплыў на распрацоўку прынцыпаў ідэнтыфікацыі, катэгарызацыі і класіфікацыі («граматыкі») тагачасных народаў. Такім чынам, канцэпцыя Б. Андэрсана акцэнтуе выключную ролю ў канструяванні калектыўнай ідэнтычнасці фармалізаваных, кадыфікаваных, аб'ектываваных сістэм, створаных магутнымі інстытутамі ўлады, як галоўнага тыпу знешняй этнічнай катэгарызацыі.

Распаўсюджанне папулярных канструктывісцкіх ідэй на постсавецкай прасторы ў канцы XX ст., звязанае ў тым ліку з незадаволенасцю састарэлымі аналітычнымі схемамі і ідыёмамі,

[1] У беларускай этналогіі канцэптуальныя ідэі Б. Андэрсана разглядаліся ў працы П. У. Церашковіча [39, с. 48–53].

прывяло да палемікі паміж прадстаўнікамі «старой школы», якія адстойвалі пазіцыі савецкай тэорыі этнасу, і прыхільнікамі заходніх канцэпцый этнічнасці [19, с. 63–78]. З таго часу прынята казаць пра супрацьстаянне дзвюх тэарэтычных парадыгмаў у постсавецкай этналогіі – прымардыялізму і канструктывізму[1].

У апошні час выразнымі сталі намаганні шэрагу даследчыкаў па распрацоўцы агульнага («сінтэтычнага») падыходу да вывучэння праблем этнічнасці [21, с. 8–10; 30, с. 158]. Такая тэндэнцыя заслугоўвае асаблівай увагі, паколькі, як сцвярджае адзін з найбольш уплывовых даследчыкаў ідэнтычнасці Р. Брубэйкер, прымардыялісцкае і канструктывісцкае разуменні этнічнасці не з'яўляюцца абавязкова ўзаемавыключальнымі. Першае можа садзейнічаць тлумачэнню, здавалася б, універсальнай тэндэнцыі да натуралізацыі і эсенцыялізацыі рэальных ці прыпісаных адрозненняў, а апошняе дазваляе растлумачыць, якім чынам этнічнасць набывае рэлевантнасць або вагу ў канкрэтных кантэкстах. Яны могуць разглядацца не як супярэчлівыя адзін аднаму, а як накіраваныя збольшага на розныя пытанні [1, с. 165].

Разглядаючы этнічнасць, расу і нацыянальнасць як спецыфічныя кагнітыўныя феномены, Р. Брубэйкер вызначыў іх як «спосабы ўспрымання, інтэрпрэтацыі і ўяўлення сацыяльнага свету». Пры гэтым ён прапанаваў адмовіцца ад групісцкага разумення этнічнасці[2], а засяродзіць сваю ўвагу на этнічна арыентаваных фрэймах, схемах і наратывах, а таксама сітуацыйных сігналах, што прыводзяць іх у дзеянне. Важна не проста сцвярджаць, *што* этнічнасць канструюецца, а вызначыць, *як* яна канструюецца. Іншымі словамі, неабходна высветліць, як і калі людзі ідэнтыфікуюць сябе, успрымаюць іншых і свет ды растлумачваюць свае праблемы ў этнічных тэрмінах, а не ў нейкіх іншых [1, с. 42–43].

Імкнучыся выпрацаваць новы падыход да вывучэння этнічнасці, які максімальна быў бы пазбаўлены рэіфікуючых канатацый, Р. Брубэйкер звярнуў асаблівую ўвагу на тэрмін «ідэнтычнасць» як аналітычную катэгорыю. Вылучыўшы і ахарактарызаваўшы «моцныя» і «слабыя» бакі ўжывання гэтага паняцця, ён прыйшоў да несуцяшальнай высновы: тэрмін «ідэнтычнасць» вельмі (а для аналітычнага выкарыстання – безнадзейна) незразумелы [1, с. 74–88]. Каб разблытаць «вузел сэнсаў», які завязаўся вакол гэтага шматзначнага тэрміна, ён прапанаваў некалькі альтэрнатыўных аналітычных ідыём.

Па-першае, больш карэктна казаць не пра «ідэнтычнасць», а пра «ідэнтыфікацыю» як працэсіўны, актыўны тэрмін, які паходзіць ад дзеяслова і пазбаўлены рэіфікуючых канатацый. Яна заклікае нас вызначыць агентаў (або актараў), якія выконваюць ідэнтыфікаванне. Тое, як чалавек ідэнтыфікуе сябе і як ён ідэнтыфікуецца іншымі, можа істотным чынам адрознівацца ў залежнасці ад кантэксту; самаідэнтыфікацыя і ідэнтыфікацыя іншымі з'яўляюцца ў аснове сваёй сітуацыйнымі і кантэкстуальнымі [1, с. 89–90].

Другім тэрмінам, прапанаваным Р. Брубэйкерам у якасці альтэрнатывы «ідэнтычнасці», з'яўляецца «самаразуменне» (або «самарэпрэзентацыя»), гэта значыць разуменне чалавекам самога сябе, свайго сацыяльнага становішча і таго, як ён гатовы дзейнічаць у межах той або іншай сітуацыі. І, нарэшце, асобна з «плавільнага катла ідэнтычнасці» правільна было б вылучыць тэрміны «агульнасць», «звязанасць» і «групавасць»: «агульнасць» азначае валоданне нейкай агульнай уласцівасцю, «звязанасць» (або «сецевасць») – наяўнасць рэляцыйных сувязей паміж людзьмі, «групавасць» – пачуццё прыналежнасці да асаблівай, абмежаванай, салідарнай групы [1, с. 95–101]. Больш гнуткія аналітычныя інструменты, прапанаваныя Р. Брубэйкерам, даволі хутка былі ўключаны ў актуальны тэарэтычны багаж не толькі заходняй, але і постсавецкай этналогіі і антрапалогіі.

---

[1] Часткай гэтай палемікі была дыскусія пра суадносіны тэрмінаў «этнічная самасвядомасць» і «этнічная ідэнтычнасць» [4].

[2] Напрыклад, наконт этнічнасці румын і венграў Р. Брубэйкер у сваёй кнізе з сімвалічнай назвай «Этнічнасць без груп» разважае наступным чынам: «Для разумення таго, як працуе этнічнасць, карысна пачынаць не з "румын" і "венграў" як груп, а з "румынскага" і "венгерскага" як катэгорый» [1, с. 55]. На метадалагічную важнасць адрознення паняццяў «група» і «катэгорыя» пры вывучэнні працэсаў этнічнай ідэнтыфікацыі звяртаў увагу амерыканскі даследчык Р. Джэнкінс. Згодна з яго азначэннем, група – гэта самаўсвядомленая супольнасць, якая «знутры» вызначаецца самімі яе членамі; у той час як катэгорыя – гэта супольнасць, якую «звонку» вылучаюць сацыёлагі і антраполагі ў адпаведнасці з пэўнымі крытэрыямі [40, p. 56].

Навуковая праблематыка, якая збліжае прадстаўнікоў разгледжаных тэарэтычных канцэпцый, – гэта высвятленне дыферэнцыяльных прыкмет, што адрозніваюць адну этнічную групу або катэгорыю ад іншай. Напрыклад, Ю. У. Брамлей сцвярджаў, што «этнас без адмежавання ад іншых падобных супольнасцей – фікцыя»; адпаведна, «этнасы – катэгорыя супастаўная»[1] [23, с. 49]. Цэнтральным сюжэтам распрацаванай ім тэорыі этнасу быў акцэнт на праблеме адрозненняў як галоўнай функцыі этнічнага. Гэта абумовіла прыярытэтную задачу савецкай этналагічнай навукі – пошук і апісанне «этнічных (этнавызначальных) прыкмет», гэта значыць комплексу характэрных адметных рыс этнічных супольнасцей, на падставе якіх магчыма ўвогуле казаць пра іх існаванне.

У межах канструктывісцкай парадыгмы выключную ролю ў вывучэнні этнічнасці набывае выяўленне сітуацыйных культурна-раздзяляльных ліній («этнічных межаў») і іх спецыфічных прыкмет («этнічных маркераў»), якія вызначаюць арганізацыйную форму этнічных адзінак. Гэта (а таксама перавага катэгарыяльнага, а не групавога падыходу да вывучэння этнічнага) робіць актуальным правядзенне дэталізаваных «кейс-стадзі» (англ. *case study*) – параўнальнага аналізу і апісання канкрэтных этнічна фрэймаваных сітуацый і падзей. Прымяненне кейс-метаду ў антрапалогіі і этналогіі набывае ўсё большую актуальнасць ва ўмовах, калі ў выніку павялічанай мабільнасці людзей ва ўсім свеце этнічныя групы перастаюць успрымацца як кампактна тэрытарыялізаваныя і прасторава абмежаваныя, а этнічныя працэсы ўсё больш складана выразна акрэсліць і лакалізаваць у прасторы.

Высновы. Такім чынам, характэрнай рысай прымардыялісцкага падыходу да вывучэння этнічнай праблематыкі з'яўляецца аб'ектывацыя этнасаў як арганічных супольнасцей людзей, дыферэнцыяцыя якіх пабудавана на «першапачатковых» культурных адрозненнях («данасцях»). Інструменталісты і канструктывісты ў большай ступені канцэнтруюць сваю ўвагу на сацыяльнай арганізацыі этнічных адрозненняў, што грунтуецца на сітуацыйных працэсах уключэння і выключэння. Этнічная ідэнтычнасць у межах канструктывізму разглядаецца як своеасаблівая сімвалічная канструкцыя – сацыяльна-вынайдзеная, дыскурсіўна-апасродкаваная і культурна-маркіраваная.

На фоне класічнага прымардыялізму канструктывісцкі падыход да вывучэння этнічнай ідэнтычнасці выяўляе новыя даследчыя задачы і перспектывы для айчынных этналагаў: гэта ў першую чаргу аналіз узаемасувязі паміж этнічнай ідэнтычнасцю, культурнымі адрозненнямі і сацыяльнай арганізацыяй; высвятленне сімвалічных меж, што канструююцца паміж этнічнымі групамі на падставе культурных маркераў іх адрознасці; параўнальная характарыстыка спосабаў прыпісвання этнічнай ідэнтычнасці сабе і прыпісвання яе іншым; дэталізаванае апісанне разнастайных форм і працэсаў дыхатамізацыі і стэрэатыпізацыі этнічных груп.

Асаблівую ўвагу трэба надаць даследаванню фармальных і нефармальных сістэм этнічнай катэгарызацыі і ідэнтыфікацыі (у тым ліку ўласна этнаграфічных класіфікацый, здольных канстытуяваць і рэіфікаваць этнічнасць).

Імкнучыся глыбей зразумець феномен этнічнай ідэнтычнасці, варта таксама ўлічваць тэндэнцыю спалучэння розных тэарэтычных падыходаў да тлумачэння складанай прыроды этнічнасці, што ўключае як аб'ектыўныя, так і суб'ектыўныя характарыстыкі яе выяўлення.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Брубейкер, Р. Этничность без групп / Р. Брубейкер ; пер. с англ. И. Борисовой. – М. : Изд. дом Высш. шк. экономики, 2012. – 406 с.

2. Эриксон, Э. Идентичность: юность и кризис : пер. с англ. / Э. Эриксон ; общ. ред. и предисл. А. В. Толстых. – М. : Прогресс, 1996. – 342 с.

3. Byron, R. Identity / R. Byron // Encyclopedia of social and cultural anthropology / ed.: A. Barnard, J. Spencer. – London ; New York, 2002. – P. 292.

[1] Тое, што ідэнтычнасць чалавека ці групы можа быць суаднесена з ідэнтычнасцю іншага ці іншых, адзначаў яшчэ Э. Эрыксан [2, с. 31]. Па сутнасці, яна суб'ектыўна перажываецца ў працэсе як асэнсавання падабенстваў з тымі, з кім чалавек сябе ідэнтыфікуе, так і асэнсавання адрозненняў ад тых, каму чалавек сябе супрацьпастаўляе.

4. Александренков, Э. Г. «Этническое самосознание» или «этническая идентичность»? / Э. Г. Александренков // Этногр. обозрение. – 1996. – № 3. – С. 13–22.

5. Тишков, В. А. Реквием по этносу: исследования по социально-культурной антропологии / В. А. Тишков. – М. : Наука, 2003. – 543 с.

6. Гражданская, этническая и региональная идентичность: вчера, сегодня, завтра / рук. проекта и отв. ред. Л. М. Дробижева. – М. : Рос. полит. энцикл., 2013. – 485 с.

7. Соколовский, С. Идентичность и идентификация: К расширению программы антропологических исследований / С. Соколовский // Свои и чужие. Метаморфозы идентичности на востоке и западе Европы / В. В. Амелин [и др.] ; под ред. Е. И. Филипповой, К. Ле Торривеллека. – М., 2018. – С. 28–50.

8. Филиппова, Е. «Сначала было слово». Дискурс национальной идентичности в России и во Франции / Е. Филиппова // Свои и чужие. Метаморфозы идентичности на востоке и западе Европы / В. В. Амелин [и др.] ; под ред. Е. И. Филипповой, К. Ле Торривеллека. – М., 2018. – С. 69–109.

9. Мартынова, М. Ю. Введение в изучение европейской идентичности и многокультурности / М. Ю. Мартынова // Очерки о европейской идентичности и многокультурности : [сборник] / Рос. акад. наук, Ин-т этнологии и антропологии ; отв. ред.-сост. М. Ю. Мартынова. – М., 2013. – С. 5–10.

10. Абашин, С. Н. Национализмы в Средней Азии: в поисках идентичности / С. Н. Абашин. – СПб. : Алетейя, 2007. – 157 с.

11. Байбурин, А. Советский паспорт: история – структура – практики / А. Байбурин. – СПб. : Изд-во Европ. ун-та в Санкт-Петербурге, 2017. – 488 с.

12. Рыжакова, С. И. Cultura Lettica: латышская национальная история и этническая идентичность / С. И. Рыжакова. – М. : ИЭА РАН, 2017. – 412 с.

13. Лескинен, М. В. Поляки и финны в российской науке второй половины XIX в.: «другой» сквозь призму идентичности / М. В. Лескинен. – М. : Индрик, 2010. – 368 с.

14. Самосюк, Н. В. Понятие «идентичность» в работах белорусских исследователей / Н. В. Самосюк // Культура. Наука. Творчество : XI Междунар. науч.-практ. конф. (Минск, 4 мая 2017 г.) : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; редкол.: Ю. П. Бондарь [и др.]. – Минск, 2017. – С. 473–477.

15. Кочетков, В. Национальная и этническая идентичность в современном мире / В. Кочетков // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 18, Социология и политология. – 2012. – № 2. – С. 144–162.

16. Гуревич, П. С. Идентичность как социальный и антропологический феномен / П. С. Гуревич, Э. М. Спирова. – М. : Канон+, 2015. – 368 с.

17. Соколовский, С. В. Парадигмы этнологического знания / С. В. Соколовский // Этногр. обозрение. – 1994. – № 2. – С. 3–17.

18. Эриксен, Т. Х. Тирания момента. Время в эпоху информации / Т. Х. Эриксен ; пер. с норв. – М. : Весь мир, 2003. – 206 с.

19. Рыбаков, С. Е. Философия этноса / С. Е. Рыбаков. – М. : ИПК Госслужбы, 2001. – 358 с.

20. Янг, К. Диалектика культурного плюрализма: концепция и реальность / К. Янг // Этничность и власть в полиэтничных государствах : материалы Междунар. конф., [25–27 янв.] 1993 г. / отв. ред. В. А. Тишков. – М., 1994. – С. 85–132.

21. Винер, Б. Е. Этничность: в поисках парадигмы изучения / Б. Е. Винер // Этногр. обозрение. – 1998. – № 4. – С. 3–26.

22. Хабенская, Е. О. Этническая идентичность: подходы к проблеме / Е. О. Хабенская // Бюл. Владикавк. ин-та упр. – 2006. – № 20. – С. 57–81.

23. Бромлей, Ю. В. Очерки теории этноса / Ю. В. Бромлей. – М. : Наука, 1983. – 412 с.

24. Чебоксаров, Н. Н. Народы. Расы. Культуры / Н. Н. Чебоксаров, И. А. Чебоксарова ; отв. ред. Ю. В. Бромлей. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Наука, 1985. – 271 с.

25. Арутюнов, С. А. Народы и культуры. Развитие и взаимодействие / С. А. Арутюнов ; отв. ред. Ю. В. Бромлей. – М. : Наука, 1989. – 246 с.

26. Козлов, В. И. Этнос. Нация. Национализм. Сущность и проблематика / В. И. Козлов. – М. : Старый сад, 1999. – 343 с.

27. Чаквін, І. У. Этнас / І. У. Чаквін // Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1989. – С. 547–548.

28. Григорьева, Р. А. Этнологические исследования в Беларуси / Р. А. Григорева, А. Вл. Верещагина-Гурко // Современная Европейская социокультурная антропология и этнология: историографические очерки / отв. ред. М. Ю. Мартынова. – М., 2018. – С. 11–48.

29. Гирц, К. Интерпретация культур / К. Гирц ; пер. с англ. – М. : РОССПЭН, 2004. – 560 с.

30. Низамова, Л. Р. Сложносоставная концепция модерной этничности: пределы и возможности теоретического синтеза / Л. Р. Низамова // Журн. социологии и соц. антропологии. – 2009. – Т. 12, № 1. – С. 141–159.

31. Cohen, A. Introduction: the lesson of ethnicity / A. Cohen // Urban ethnicity / ed. A. Cohen. – London, 1974. – P. IX–XXIV.

32. Бергер, П. Социальное конструирование реальности: трактат по социологии знания / П. Бергер, Т. Лукман. – М. : Моск. филос. фонд, 1995. – 323 с.

33. Андерсон, Б. Воображаемые сообщества: размышления об истоках и распространении национализма / Б. Андерсон ; пер. с англ. В. Г. Николаевой ; под ред. С. П. Баньковской. – М. : Кучково поле, 2016. – 416 с.

34. Геллнер, Э. Нации и национализм / Э. Геллнер ; пер. с англ. Т. В. Бердиковой, М. К. Тюнькиной ; ред. и послесл. И. И. Крупника. – М. : Прогресс, 1991. – 320 с.

35. The invention of tradition / ed.: E. Hobsbawm, T. Ranger. – Twelfth printing. – Cambridge : Cambridge Univ. Press, 2004. – 320 p.

36. Барт, Ф. Введение / Ф. Барт // Этнические группы и социальные границы: социальная организация культурных различий / под ред. Ф. Барта ; пер. с англ. И. Пильщикова. – М., 2006. – С. 9–48.

37. Barth, F. Enduring end emerging issues in the analysis of ethnicity / F. Barth // Anthropology of ethnicity: beyond «Ethnic groups and boundaries» / ed.: H. Vermeule, C. Govers. – Amsterdam, 1994. – P. 11–32.

38. Eriksen, T. H. Ethnicity and nationalism: anthropological perspectives / T. H. Eriksen. – 3nd ed. – London : Pluto Press, 2010. – 246 p.

39. Терешкович, П. В. Этническая история Беларуси XIX – начала XX в.: в контексте Центрально-Восточной Европы / П. В. Терешкович. – Минск : БГУ, 2004. – 223 с.

40. Jenkins, R. Rethinking ethnicity: arguments and explorations / R. Jenkins. – 2nd ed. – London : SAGE, 2008, 2008. – 207 p.

References

1. Brubaker R. *Ethnicity without groups*. Cambridge, Harvard University Press, 2006. 283 p.

2. Erikson E. H. *Identity: youth and crisis*. New York, W. W. Norton Company, 1968. 336 p.

3. Byron R. Identity. *Encyclopedia of social and cultural anthropology.* London, New York, 2002, p. 292.

4. Aleksandrenkov E. G. “Ethnic self-consciousness” or “ethnic identity”? *Etnograficheskoe obozrenie = Ethnographic Review,* 1996, no. 3, pp. 13–22 (in Russian).

5. Tishkov V. A. *Requiem for ethnos: research in social and cultural anthropology*. Moscow, Nauka Publ., 2003. 543 p. (in Russian).

6. Drobizheva L. M. (ed.). *Civic, ethnic and regional identity: yesterday, today, tomorrow*. Moscow, Rossiiskaya politicheskaya entsiklopediya Publ., 2013. 485 p. (in Russian).

7. Sokolovskii S. Identity or identification: to expand the anthropological research program. *Svoi i chuzhie. Metamorfozy identichnosti na vostoke i zapade Evropy* [Their own and others’. Identity metamorphoses in Eastern and Western Europe]. Moscow, 2018, pp. 28–50 (in Russian).

8. Filippova E. “In the Begining Was the Word”. Discourse of national identity in Russia and France. *Svoi i chuzhie. Metamorfozy identichnosti na vostoke i zapade Evropy* [Their own and others’. Identity metamorphoses in Eastern and Western Europe]. Moscow, 2018, pp. 69–109 (in Russian).

9. Martynova M. Yu. Introduction to the study of European identity and multiculturalism. *Ocherki o evropeiskoi identichnosti i mnogokul'turnosti* [Essays on European identity and multiculturalism]. Moscow, 2013, pp. 5–10 (in Russian).

10. Abashin S. N. *Nationalisms in Central Asia: in search of identity.* St. Petersburg, Aleteiya Publ., 2007. 157 p. (in Russian).

11. Baiburin A. *Soviet passport: history – structure – practices*. St. Petersburg, Publishing House of the European University, 2017. 488 p. (in Russian).

12. Ryzhakova S. I. *Cultura Lettica: Latvian national history and ethnic identity*. Moscow, Institute of Ethnology and Anthropology RAS, 2017. 412 p. (in Russian).

13. Leskinen M. V. *Poles and the Finns in the Russian science at the second half of the 19th century. “Other” through the prism of identity*. Moscow, Indrik Publ., 2010. 368 p. (in Russian).

14. Samosyuk N. V. The concept of “identity” in the works of Belarusian researchers. *Kul'tura. Nauka. Tvorchestvo: XI Mezhdunarodnaya nauchno-prakticheskaya konferentsiya (Minsk, 4 maya 2017 g.): sbornik nauchnykh statei* [Culture. Science. Arts: XI International scientific and practical conference (Minsk, May 4, 2017): collection of scientific articles]. Minsk, 2017, pp. 473–477 (in Russian).

15. Kochetkov V. National and ethnic identity in the modern world. *Vestnik Moskovskogo universiteta. Seriya 18, Sotsiologiya i politologiya = Moscow State University Bulletin. Series 18. Sociology and Political Science,* 2012, no. 2, pp. 144–162. (in Russian).

16. Gurevich P. S., Spirova E. M. *Identity as a social and anthropological phenomenon.* Moscow, Kanon+ Publ., 2015. 368 p. (in Russian).

17. Sokolovskii S. V. Paradigms of ethnological knowledge. *Etnograficheskoe obozrenie = Ethnographic Review,* 1994, no. 2, pp. 3–17 (in Russian).

18. Eriksen T. H. *Tyranny of the moment: fast and slow time in the information age*. London, Pluto Press, 2001. 192 p.

19. Rybakov S. E. *The philosophy of ethnos*. Moscow, IPK State Services, 2001. 358 p. (in Russian).

20. Young C. The dialectics of cultural pluralism: concept and reality. *The rising tide of cultural pluralism: the nation state at bay?* Madison, 1993, pp. 3–35.

21. Wiener B. E. Ethnicity: in the search of paradigm. *Etnograficheskoe obozrenie = Ethnographic Review,* 1998, no. 4, pp. 3–26 (in Russian).

22. Khabenskaya E. O. Ethnic identity: approaches to the problem. *Byulleten' Vladikavkazskogo instituta upravleniya* [Bulletin of the Vladikavkaz Institute of Management], 2006, no. 20, pp. 57–81 (in Russian).

23. Bromlei Yu. V. *Essays on the theory of ethnos*. Moscow, Nauka Publ., 1983. 412 p. (in Russian).

24. Cheboksarov N. N., Cheboksarova I. A. *Ethnoses, races, cultures*. 2nd ed. Moscow, Nauka Publ., 1985. 271 p. (in Russian).

25. Arutyunov S. A. *Peoples and cultures: development and interaction.* Moscow, Nauka Publ., 1989. 246 p. (in Russian).

26. Kozlov V. I. *Ethnos. Nation. Nationalism. Essence and problematics*. Moscow, Staryi sad Publ., 1999. 343 p. (in Russian).

27. Chakvin I. U. Ethnos. *Ethnography of Belarus: encyclopedia*. Minsk, 1989, pp. 547–548 (in Belarusian).

28. Grigor'eva R. A., Vereshchagina-Gurko A. V. Ethnological researches in Belarus. *Sovremennaya Evropeiskaya sotsiokul'turnaya antropologiya i etnologiya: istoriograficheskie ocherki* [Contemporary European sociocultural anthropology and ethnology: historiographical essays]. Moscow, 2018, pp. 11–48 (in Russian).

29. Geertz C. *The Interpretation of cultures. Selected essays.* New York, Basic Book Publ., 1973. 470 p.

30. Nizamova L. R. The compound concept of modern ethnicity: the limits and sources of theoretical synthesis. *Zhurnal sotsiologii i sotsial'noi antropologii = The Journal of Sociology and Social Anthropology,* 2009, vol. 12, no. 1, pp. 141–159 (in Russian).

31. Cohen A. Introduction: the lesson of ethnicity. *Urban ethnicity*. London, 1974, pp. IX–XXIV.

32. Berger P. L., Luckmann T. *The social construction of reality. A treatise on sociology of knowledge*. New York, Anchor Books, 1966. 240 p.

33. Anderson B. *Imagined communities: reflections on the origin and spread of nationalism*. London, Verso Editions, 1983. 160 p.

34. Gellner E. *Nations and nationalism (New perspectives on the past)*. Oxford, Basil Blackwell, 1983. 170 p.

35. Hobsbawm E., Ranger T. (eds.). *The invention of tradition.* Twelfth printing. Cambridge, Cambridge University Press, 2004. 320 p.

36. Barth F. Introduction. *Ethnic groups and boundaries: The social organization of cultural difference*. London, Allen & Unwin, 1969, pp. 9–38.

37. Barth F. Enduring end emerging issues in the analysis of ethnicity. *Anthropology of ethnicity: beyond «Ethnic groups and boundaries».* Amsterdam, 1994, pp. 11–32.

38. Eriksen T. H. *Ethnicity and nationalism: anthropological perspectives.* 3nd ed. London, Pluto Press, 2010. 246 p.

39. Tereshkovich P. V. *Ethnic History of Belarus XIX – early XX century: In the context of Central-Eastern Europe*. Minsk, Belarusian State University, 2004. 223 p. (in Russian).

40. Jenkins R. *Rethinking ethnicity: arguments and explorations*. 2nd ed. London, SAGE, 2008. 207 p.

Информация об авторе

Внукович Юрий Иосифович – кандидат исторических наук, старший научный сотрудник. Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы, Национальная академия наук Беларуси (ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: jurasis22@gmail.com https://orcid.org/0000-0003-2037-8150

Information about the author

Yury I. Vnukovich – Ph. D. (Hist.), Senior Researcher. Center for Research of Belarusian Culture, Language and Literature of the National Academy of Sciences of Belarus (1 Surganov Str., Bldg 2, Minsk 220072, Belarus). E-mail: jurasis22@gmail.com https://orcid.org/0000-0003-2037-8150